на, дапаможа стварыць глыбокі, аб'ектыўна правільны вобраз нацыянальнай дзяржаўнай ідэі, разгледзець яе ў развіцці, прааналізаваць, як ішло яе фарміраванне на розных гістарычных этапах.

*Літаратура*

1. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2 ч. Мн., 1994. Ч. 1.
2. Публицистика белорусских народников. Мн., 1983.
3. *Доўнар-Запольскі М. В.* Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.
4. *Карскі Я.* Беларусы / уклад. і камент. С. Гаранiна і Л. Ляўшун; навук. рэд. А. Мальдзіс. Мн., 2001.
5. *Луцкевіч А. І.* За дваццаць пяць гадоў (1903—1928): Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый (Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада). Мн., 1991.
6. *Лёсік Я.* Творы: Апавяданні. Казкі. Артыкулы / уклад., прадм., камент. А. Жынкіна. Мн., 1994.
7. БДАМЛІМ, ф. 3, вып. 1, с.139.
8. *Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І.* На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917—1920 гг.). Мн., 1999.
9. Тамсама.
10. *Турук Ф.* Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов. М., 1921.
11. *Канчер Ч. С.* Из истории общественных национальных и революционных движений белорусов // Неман. 1993. № 1. С. 136—167.
12. *Рудовіч С.* Час выбару. Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. Мн., 2001.

*Summary*

*Problems of national state idea, its development and formation on different historical stages are discussed in the article.*

*УДК 942.086+947.084.8*

***І. У. Жылінская***

# САЮЗ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ І СССР У ГРАМАДСКАЙ ДУМЦЫ АНГЛІІ НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1939—1941 гг.)

З другой паловы 30-х гг. ХХ ст. у брытанскім грамадстве захоўваўся шырокі спектр думак адносна шляхоў захавання міру і забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Гэта праблема актуалізавалася ў канцы 30-х гг. і была звязана з агрэсіўнай палітыкай нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў. У такім выпадку ўсё больш увагі надавалася стварэнню саюзаў, якія змогуць супрацьстаяць фашыстам у магчымай вайне. У гэтым сэнсе Савецкі Саюз быў вядучым палітычным, эканамічным і ваенным элементам еўрапейскага міжнароднага супольніцтва. Але палярнасць грамадска-палітычных і ідэалагічных сістэм СССР і еўрапейскіх капіталістычных краін стварала шмат бар'ераў у працэсе палітычнага і ваеннага збліжэння дзяржаў перад пагрозай новай сусветнай вайны. Таму менавіта саюз з гэтай краінай выклікаў шмат дыскусій у брытанскім грамадстве.

У пачатку 1938 г. ва ўрадзе Вялікабрытаніі і грамадстве захоўваў папулярнасць курс на прымірэнне з агрэсарам, эпагеем якога стала Мюнхенскае пагадненне. Разам з тым палітыка ўрада Н. Чэмберлена мела яўную антысавецкую накіраванасць.

Аднак спадзяванні, якія ўзніклі ў многіх англічан у сувязі з Мюнхенскім пагадненнем, хутка развеяліся. Як паказала вывучэнне настрояў насельніцтва Англіі Брытанскім інстытутам грамадскай думкі (БІГД), у канцы 1938 г. большая частка англічан страціла веру ў тое, што А. Гітлер не мае тэрытарыяльных прэтэнзій у Еўропе, для іх стала яснай сутнасць нацысцкага рэжыму. У студзені 1939 г. пасол СССР у Вялікабрытаніі І. М. Майскі паведамляў у НКЗС: «Працэс працвеаражэння (маецца на ўвазе ад палітыкі прымірэння. — *І. Ж.*) ідзе поўным ходам. Гэта адчуваецца ў парламенце, прэсе, Сіці, грамадскіх колах» [1, с. 179]. Падобны працэс закрануў прыхільнікаў прымірэння. Усё часцей сталі адчувацца ноткі расчаравання такой палітыкай у прамовах Н. Чэмберлена, Лондандэры і інш. Кансерватыўная газета «Абсервер» прама ўказвала: «Не па віне прэм'ер-міністра ці каго-небудзь з яго прыхільнікаў вынікі Мюнхена з'явіліся горкім расчараваннем» [1, с. 179; 2]. У такой сітуацыі ідэя збліжэння з СССР набывала ўсё большую колькасць прыхільнікаў у парламенце і краіне. У сакавіку 1939 г. лідэр лібералаў А. Сінклер расказваў аб тым, што на працягу апошніх месяцаў на шматлікіх сходах «ён зрывае самыя бурныя і сяброўскія апладысменты, калі гаворыць аб неабходнасці англа-савецкага супрацоўніцтва» [3, с. 378—380; 4, р. 5]. Гэта пацвярджалі многія лейбарысты і нават кансерватары.

Пасля ліквідацыі нацыстамі дзяржаўнай незалежнасці Чэхаславакіі магчымасць кам-

прамісу з А. Гітлерам разглядалася брытанскай грамадскасцю як наўрад ці магчымая. Англічане сталі схіляцца да таго, што толькі рашучая палітыка супрацьдзеяння агрэсару здольна забяспечыць бяспеку краіны [5, с. 14]. У сувязі з гэтым усё больш адчувалася неабходнасць саюза з СССР, што ні аднойчы пацвярджаў І. М. Майскі ў сваіх данясеннях у НКЗС. Ён падкрэсліваў, што «настрой шырокіх колаў насельніцтва рэзка антыгерманскі. Неабходнасць супраціўлення агрэсіі становіцца ўсеагульным перакананнем <…> адсюль і папулярнасць у масах ідэі саюза з СССР» [1, с. 425]. Аб гэтым сведчаць лічбы даследаванняў БІГД, згодна з якімі ў красавіку 1939 г. абсалютная большасць рэспандэнтаў (87 %) падтрымлівала ідэю супрацоўніцтва з савецкай дзяржавай [6, с. 55].

Што тычыцца кіраўніцтва Брытанскай імперыі, то пры разглядзе магчымасці саюза з СССР яго ў першую чаргу цікавіла магчымасць савецкіх узброеных сіл аказаць істотную дапамогу Англіі ў выніку вайны. У гэтай сувязі трэба адзначыць, што А. Гітлер з 1937 г. не разглядаў СССР як буйны ваенны фактар. Ён і яго акружэнне лічылі, што Чырвоная Армія не зможа аправіцца пасля ўдару, нанесенага ёй рэпрэсіямі, і выступіць баяздольнай сілай. Нацысцкія лідэры і разведка недаацэньвалі ваенны патэнцыял СССР і магчымасці яго эканомікі, а таксама маральна-палітычны фактар [7, с. 122]. Гэты пралік вызначыў у 1941 г. крушэнне стратэгіі бліцкрыгу і ілюзіі лёгкай перамогі над СССР.

Ваеннае і палітычнае кіраўніцтва заходніх краін атрымлівала ў 1938—1939 гг. супярэчлівыя звесткі аб стане ваеннага патэнцыялу СССР. Пры гэтым толькі нямногія дыпламаты і ваенныя давалі аптымістычныя адзнакі. Большасць экспертаў падкрэслівала рэзкае зніжэнне моцы Чырвонай Арміі пад уздзеяннем рэпрэсій. Так, у маі 1938 г. брытанскі ваенны аташэ Р. Файберс гаварыў французскаму паслу Кулондру аб тым, што трэба ўлічваць і моцныя, і слабыя бакі Чырвонай Арміі: «Яе сіла ў колькасці дывізій, колькасці танкаў і самалётаў і ўвогуле ў яе матэрыяльнай частцы. Армія, аднак, сур'ёзна паслаблена рэпрэсіямі» [8, с. 95].

Такім чынам, аналізуючы брытанскія дакументы, можна зрабіць выснову: адзінадушная думка ў асяроддзі брытанскага ваеннага кіраўніцтва зводзілася да таго, што рэпрэсіі супраць вышэйшага каманднага саставу Чырвонай Арміі знізілі яе наступальныя здольнасці. Варта падкрэсліць, што адназначна негатыўных ацэнак стану абароны СССР пры гэтым не выказвалася. Па-другое, Чырвоная Армія, адданая свайму ўраду, калі будзе аддадзены такі загад, стане змагацца ў наступальнай ці абарончай вайне [8, с. 98].

Акрамя ваеннага пытання, пры абмеркаванні выгады ад саюза з СССР англічане надавалі ўвагу і таму, наколькі эканоміка Савецкай краіны і палітычны лад увогуле змогуць вытрымаць выпрабаванні вайной. Выдадзеныя брытанскія дакументы даюць магчымасць гаварыць аб тым, што частка прадстаўнікоў брытанскага ўрада прыходзілі да вываду аб трываласці савецкага рэжыму. Так, у дэпешы брытанскага пасла ў Маскве У. Сідса ад 6 сакавіка 1939 г. падкрэслівалася, што «савецкі рэжым такі ж трывалы, як гэта магчыма з упэўненасцю казаць аб любым іншым рэжыме…» Далей У. Сідс звяртаў увагу на тую акалічнасць, што «ён (маецца на ўвазе савецкі рэжым. — *І. Ж.*) адрозніваецца ад царскай Расіі большай маральнай трываласцю, якая дазваляе супрацьстаяць любому напружанню…» [8, с. 96]. Сакратар брытанскага пасольства ў Маскве Ф. Маклін падкрэсліваў, што з'яўляецца памылковым лічыць, што такога паняцця, як савецкі патрыятызм, не існуе. Ён рабіў выснову, што, нягледзячы на магчымую дэстабілізацыю становішча ў СССР у выпадку вайны, палітычны пераварот унутры краіны не адбудзецца [8, с. 97].

Вясной 1939 г. пад уздзеяннем росту агрэсіўнасці нацысцкага рэйха, патрабаванняў парламенцкіх колаў і грамадскасці ўрад вымушаны быў звярнуць увагу на свае адносіны з СССР. Унутры кабінета міністраў не існавала адзінай думкі па гэтым пытанні. Міністр каардынацыі абароны лорд Чэтфілд, міністр унутраных спраў С. Хор і ваенны міністр Хор-Беліша лічылі неразумным ігнараваць СССР. Міністр па справах калоній М. Макдональд у сваім выступленні ў камітэце знешняй палітыкі падкрэсліваў, што не менш важна, каб у вайне Расія выступіла на баку Вялікабрытаніі, а не заставалася нейтральнай, ці заняла бок Германіі. У выпадку апошняга Германія змагла б атрымліваць ад СССР сыравіну. Міністр па справах дамініёнаў Т. Інекіп звяртаў увагу на магчымую ролю савецкіх узброеных сіл на Далёкім Усходзе як на фактар, які можа аказаць стрымліваючае ўздзеянне на Японію [8, с. 106].

Дж. Дэвіс, які наведаў Маскву, сцвярджаў, што саюз Англіі, Францыі і Савецкага Саюза неабходны. У сваім пісьме прэзідэнту ЗША Ф. Рузвельту ён падкрэсліваў: «Савецкі ўрад, як і яго армія, значна мацней, чым гэта прызнаецца ў некаторых еўрапейскіх колах. Больш

таго, захавання міру на доўгія гады патрабуюць эканамічныя патрэбы СССР» [9, p. 136].

Прем'ер-міністр Н. Чэмберлен і міністр фінансаў Д. Сайман былі настроены ў вышэйшай ступені скептычна, абгрунтоўваючы сваю нясхільнасць да саюза з СССР у большай ступені ідэалагічнымі меркаваннямі: «Я ніколькі не веру ў магчымасць Расіі весці эфектыўнае наступленне, — падкрэсліваў Н. Чэмберлен, — у мяне няма даверу і да яе матываў» [8, с. 96]. Да перамоў з Масквой яго прымушаў моцны ціск з боку грамадскасці і палітычных колаў. Так, у некаторых каментарыях на прапановы Савецкага Саюза ўказвалася, што запыты ў адрас СССР робяцца з мэтай заспакоіць левае крыло ў Англіі, а не дзеля таго, каб атрымаць якую-небудзь ваенную перавагу [8, с. 104]. Такая пазіцыя прэм'ер-міністра прадвызначыла вынік англа-французска-савецкіх перамоў 1939 г.

Што тычыцца адносін шырокіх колаў англійскай грамадскасці да заключэння саюза з СССР падчас перамоў, то тут вызначальным з'явілася апытанне БІГД, якое было праведзена ў чэрвені 1939 г. Яно дало магчымасць сцвярджаць, што СССР займаў трэцяе месца (пасля ЗША і Францыі) у спісе краін, якім рэспандэнты аддавалі перавагу, і чацвёртае (пасля Германіі, Японіі і Італіі) у спісе тых дзяржаў, да якіх рэспандэнты не адчувалі сімпатыі [6, с. 55].

Такім чынам, можна сказаць, што падчас англа-франка-савецкіх перамоў 1939 г. ні ў палітычных, ні ў грамадскіх колах Вялікабрытаніі не было адзінай думкі наконт важнасці заключэння саюза з СССР. Разумеючы важнасць дапамогі, якую СССР можа аказаць у выніку вайны, англічане апасаліся гэтай краіны, асабліва яе ідэалагічнага ўздзеяння на насельніцтва Брытанскай імперыі.

Вялікі ўдар па іміджы Савецкай краіны ў Вялікабрытаніі нанесла савецка-германскае пагадненне об ненападзенні. У дакументах пасольства СССР у Лондане згадвалася аб «першай антысавецкай хвалі» ва ўрадавых колах, хоць і адзначалася, што яна не дасягнула вялікай моцы. Кансерватары адрэагавалі на пагадненне спакойна і лічылі, што яно не ўносіць істотных змяненняў. Рэзкай крытыцы сталінскую лінію знешняй палітыкі падверглі лібералы і лейбарысты. Для іх заключэнне дагавора стала сапраўды неспадзяваным.

Разам з тым частка палітычных дзеячаў Англіі ў сувязі з пактам Молатава — Рыбентропа падверглі рэзкай крытыцы курс Н. Чэмберлена. Так, Лойд Джордж заяўляў, што савецкі ўрад праявіў даволі цярплівасці падчас перамоў з Англіяй і Францыяй, ён чакаў падобнага кроку значна раней [10, с. 312]. Э. Бівен, адзін з галоўных ідэолагаў левага лейбарызму, запэўніў, што нават зараз, пасля заключэння савецка-германскага пагаднення, перамовы паміж Англіяй і СССР павінны працягвацца. Такія ж заявы сустракаліся і на старонках газеты «Нью стэйтсмэн энд Нэйшн». Яе рэдактар К. Мартын лічыў, што пакт з Германіяй адпавядае нацыянальным інтарэсам Расіі.

Пасля ўступлення Чырвонай Арміі 17 верасня 1939 г. на тэрыторыю Заходняй Беларусі і Украіны, а ў далейшым далучэнне іх да Савецкага Саюза, у Англіі пачалася, па словах І. М. Майскага, «другая хваля антысавецкага шаленства». У друку, па радыё даваліся паведамленні аб «удары ў спіну», аб новым падзеле Польшчы паміж Германіяй і СССР.

Аналіз англійскай кансерватыўнай прэсы за гэты перыяд сведчыць аб тым, што яе пазіцыя заставалася антысавецкай. Аднак усё часцей гучалі выказванні аб тым, што такая акцыя СССР у Польшчы прадыктавана нацыянальнымі інтарэсамі рускіх, і ў першую чаргу меркаваннямі аб бяспецы Савецкага Саюза.

Ліберальная прэса выказвала абурэнне наконт уступлення савецкіх войск у Польшчу, але паступова пачала схіляцца да таго, што гэта быў вымушаны крок з боку СССР з мэтай абароны інтарэсаў першай сацыялістычнай дзяржавы. Так, «Нью хронікл» пісала аб тым, што хуткасць нямецкага прасоўвання па тэрыторыі Польшчы дала магчымасць стварэння ліній фронту побач з савецкімі тэрыторыямі. Больш таго, газета разглядала акцыю ўступлення Чырвонай Арміі на тэрыторыю Польшчы як «ратаванне польскіх украінцаў і беларусаў ад германскага нападу [11].

Супярэчлівую адзнаку палітыкі СССР выказаў адзін з ідэолагаў левага лейбарызму Дж. Коул. Крытыкуючы падпісанне пакта, ён у той жа час падтрымаў ідэю заходняй мяжы Савецкага Саюза па лініі Керзана і заявіў, што не абвінавачвае І. Сталіна ў нападзе на Польшчу з мэтай стрымлівання немцаў [12].

Неадназначна да падзей жніўня — верасня 1939 г. было настроена брытанскае грамадства. Аб гэтым сведчыць сацыялагічнае апытанне, што было праведзена праз тыдзень пасля ўступлення Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі і Украіны. Яно паказала, што 31 % апытаных лічаць, што СССР дапамог Германіі развязаць вайну супраць Вялікабрытаніі, 29 % рэспандэнтаў выказалі думку, што СССР наадварот перашкодзіў нацыстам распачаць вайну супраць Брытанскай імперыі. Амаль кожны восьмы ўдзельнік апы-